Іваноў Я.Я. (Магілёў)

# МАКСІМА ЯК СЕМАНТЫЧНЫ ТЫП АФАРЫСТЫЧНАГА ВЫКАЗВАННЯ

У вызначэнні семантыкі афарыстычнага выказвання і яго асноўных семантычных тыпаў пакуль што не існуе спаразумення як сярод лінгвістаў, так і наогул сярод даследчыкаў афарызма як аб'екта іншых філалагічных дысцыплін. Гэта абумоўлена адсутнасцю, найперш, спаразумення ў вызначэнні самага паняцця афарызма як прадуктаў маўленча-мысліцельнай дзейнасці, і па-другое, як спецыфічнай перш за ўсё па сваіх семантычных асаблівасцях структурнай разнавіднасці выказвання.

Па сваёй семантыцы афарызмы з'яўляюцца выказваннямі, у якіх у абагульненай форме выражаюцца тыя ці іншыя сувязі паміж прадметамі, з'явамі і г.д. пазамоўнай рэчаіснасці або пэўныя іх характарыстыкі (resp. уласцівасці). Паколькі ў афарыстычных выказваннях (паводле наяўнасці ў іх семантыкі абагульнення рэчаіснасці) выражаюцца сувязі паміж не асобнымі, адзінкавымі, канкрэтнымі прадметамі і з'явамі (і іх уласцівасці), а прадметамі або з'явамі як агульнымі паняццямі, то і адпаведныя іх уласцівасці і сувязі паміж імі набываюць яскрава агульны характар. Апошняе прадугледжвае, у сваю чаргу, істотнасць і пастаянства названых уласцівасцей і сувязей як фактараў рэальнага або выдуманага свету, г.зн. іх заканамернасць. Таму ў афарыстычных выказваннях выражаюцца менавіта заканамерныя сувязі паміж аб'ектамі рэчаіснасці і заканамерныя іх уласцівасці.

Заканамернасці сувязей паміж прадметамі, з'явамі і г.д. рэчаіснасці і заканамернасці іх існавання (resp. уласцівых ім якасцей), што выражаюцца ў афарыстычных выказваннях, натуральна ўяўляюць вельмі неаднародную сукупнасць. Яны, напраклад, неаднолькавыя па сферы свайго дзеяння, па ўмовах і формах свайго праяўлення, па ступені неабходнасці свайго існавання, па сваёй адпаведнасці рэальнаму парадку рэчаў у свеце (або ўяўленню аб ім) і г.д. У залежнасці ад гэтага вылучаюцца больш-менш аднародныя групоўкі афарыстычных выказванняў, у якіх выражаюцца пэўныя тыпы названых заканамернасцей, - адпаведныя семантычныя тыпы афарызмаў.

Неаднародныя па сваёй семантыцы афарыстычныя выказванні размяжоўваюцца рознымі даследчыкамі на падставе розных крытэрыяў і на неаднолькавую колькасць змястоўна-сэнсавых (resp. семантычных) тыпаў. Сярод апошніх традыцыйна вылучаюць дзве вялікія групы



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

(пераважна літаратурных) афарызмаў - “сентэнцыі” і “максімы”. Аднак агульнапрынятага разумення названых разнавіднасцей афарыстычнага выказвання яшчэ не ўфармавалася, нягледзячы на даволі даўняе існаванне гэтых паняццяў у азначаным сэнсе. У прыватнасці, пад максімай можа разумецца і афарыстычнае выказванне, што змяшчае нейкае “правіла” паводзін чалавека, і афарызм, у якім выражаецца пэўны “лагічны ці этычны прынцып” або “норма” жыцця чалавека, і “маралістычная” па зместу “разнавіднасць сентэнцыі” (!) і г.д. Цікава, што як максіма можа вызначацца яшчэ і ўсякае ўстойлівае ў маўленні фарыстычнае выказванне з прамой матывіроўкай агульнага значэння (у процiпастаўленне “пераасэнсаваным” прыказкам).

Усе неістотныя, неабавязковыя і нерэгулярныя заканамернасці існавання аб’ектаў рэчаіснасці ці пэўных сувязей паміж імі размяжоўваюцца на два тыпы па крытэрыю абавязковасць/неабавязковасць свайго праяўлення ў сацыяльнай і/або духоўнай сферы жыцця чалавека. Афарыстычныя выказванні, у якіх выражаюцца тыя заканамернасці сацыяльнага і/або духоўнага жыцця чалавека, што абавязкова прадугледжваюць яго адпаведную паводзінскую рэакцыю, можна вызначыць як максімы. Афарыстычныя выказванні-максімы змяшчаюць сацыяльныя, маральныя, бытавыя парады, прадпісанні, правілы і т.п., якія скіраваны на тое, каб абмежаваць чалавека ў сферы яго канкрэтных учынкаў і адпаведных задум, намераў, падштурхнуць яго да пэўных, неабходных дзеянняў або забараніць іх ці засцерагчы ад іх, наогул выказаць узор (resp. норму) паводзін, якіх пажадана або трэба безумоўна прытрымлівацца ў жыцці. Напр.: *Куй железо, пока горячо; Мойте руки перед едой; Вучыся, нябожа, вучэнне паможа* (Я.Купала). У якасці граматычных сродкаў афармлення выступаюць усе сродкі ўтварэння сінтаксічнага значэння пабуджальнасці (і неабходнасці, павіннасці), спецыфічныя для кожнай з моў.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова